**М. М. Воінава-Страха**

# АДМЕТНАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПСІХАЛАГІЗМУ Ў ЖАНРЫ НАВЕЛЫ

Сярод ключавых вызначальных рыс навелістычнага жанру вылучаецца лаканізм, дынамізм, кантраснасць, парадаксальнасць, "пуэнтычнасць" (востры, рэзкі, нечаканы паварот), прасторава-часавая лакалізацыя, сфакусаванасць на адзінай незвычайнай падзеі. Тым не менш за некалькі стагоддзяў існавання навела пацвердзіла сваю ўніверсальнасць з пункту гледжання магчымасці асвятлення любога кола пытанняў: ад простых бытавых замалёвак да глыбокага асэнсавання складаных анталагічных праблем. Гэта тэндэнцыя абумоўлівае натуральны зварот да шырокага выкарыстання магчымасцяў псіхалагічнага пісьма, першапачаткова ў шырокім фармаце не прадугледжаных класічнай паэтыкай.

Праявы акрэсленага працэсу назіраюцца ўжо ў навелістычных творах XIX стагоддзя. Так, адметнасцю малой прозы амерыканскага пісьменніка Э. По з'яўляецца пашырэнне жанравых рамак за кошт стварэння адмысловай псіхалагічнай карціны. Увага ў творах мастака слова сканцэнтравана не на падзейным узроўні, а на сузіранні эмацыянальнага стану героя. Э. По стварае яскравыя псіхалагічныя характарыстыкі сваіх персанажаў. Пад пяром аўтара любая дэталь існуе не апасродкавана, як частка побыту, яна ўваходзіць у плынь унутраных перажыванняў, становіцца сродкам раскрыцця складаных эмацыянальных працэсаў. У творы "Лігея" аўтарам ствараецца так званы "падвойны псіхалагізм", "псіхалагізм у псіхалагізме", бо кожная з дэталей партрэта ў такой жа меры, як і сама Лігея, – гэта адначасова і сродак раскрыцця ўнутранага стану асобы.

У айчыннай малой прозе яркі зварот да псіхалагізацыі назіраецца ў творчасці Цёткі. Наратыўная прастора яе твораў ("Лішняя", "Зваротлівы", "Зялёнка", "Міхаська" і нш.) ускладняецца шматлікімі відамі псіхалагічнага аналізу: розныя віды маналога, мастацкая дэталь, апасіяпеза і інш.

Адметнасцю навелістыкі М. Гарэцкага з'яўляецца няспыннае імкненне аўтара да асэнсавання душэўных антыномій сваіх персанажаў. У яго тэкстах назіраецца тэндэнцыя да выразнага адлюстравання асобаснага пачатку. Псіхалагізм твораў М. Гарэцкага носіць дэманстратыўны характар, яго паэтыцы, як правіла, не ўласцівы недагаворанасць, замоўчванне, падтэкставы змест. Сярод важнейшых прыёмаў псіхалагізму, выкарыстаных айчынным класікам, з'яўляюцца: мастацкая дэталь (пейзаж, партрэт і г.д.), часткова "дыялектыка душы", розныя віды маналога. "Чысты" маналог, пазбаўлены аўтарскага ўмяшальніцтва, адлюстраваны ў навеле "Страхаццё", першая частка якой прадстаўлена ў форме самааналізу цэнтральнага персанажа Гаўрылы. У навеле "Стары прафесар" атмасфера псіхалагічнага напружання ствараецца шляхам адначасовага спалучэння ўнутранага маналога і непасрэднага аўтарскага аповеду, адкрытага маналога і псіхалагічнага аналізу наратара.

Выразнымі адзнакамі навелістычнай творчасці ў другой палове XX стагоддзя з'яўляюцца дакладнасць, лаканізм і яскравы псіхалагізм пісьма. Найбольш рэпрэзентатыўныя прыклады прадстаўлены ў малой прозе У. Караткевіча. Так, у тэксце "Паляшук" дыялагічная прастора істотна пашыраецца ў тым ліку і дакладнай псіхалагічнай матывацыяй дзеяння, што прыводзіць да пэўнай жанравай трансфармацыі. Падобныя прыкметы знаходзім і ў іншых тэкстах айчыннага мастака слова: "Карней – мышыная смерць", "У шалашы" і інш.

Актыўнай тэндэнцыяй у развіцці жанру на сучасным этапе развіцця айчыннага мастацтва слова з'яўляецца змяшчэнне дзеяння са знешняга ва ўнутраны падзейны план. У цэнтры ўвагі аўтараў – праца падсвядомага, экзістэнцыя ва ўсёй складанасці і шматстайнасці праяўлення. Натуральна, што падобная тэндэнцыя заканамерна ўзмацняе псіхалагічны складнік у рамках навелістычнага тэксту, што, у залежнасці ад формаў і сродкаў мастацкага выражэння, бясспрэчна прыводзіць да пашырэння наратыўнай прасторы і спрыяе развіццю разнастайных мадыфікацыйных працэсаў.

Так, навела "Маці" В. Адамчыка вылучаецца, здавалася б, не ўласцівым гэтаму жанру статычным характарам. Адзінае, што сведчыць пра дынаміку, – рух тралейбуса і выхад апавядальніка на прыпынку. Вядучы ж стрыжань знаходзіцца не звонку, як гэта бывае традыцыйна, а ўнутры – у свядомасці апавядальніка. Акрэсленая ў творы з'ява прадстаўлена праз уяўленні, меркаванні, ураджанні наратара. Уласцівы класічнай навеле дынамізм у развіцці сюжэта прысутнічае ў межах псіхаэмацыянальнай сферы. Так званы рэзкі паварот адбываецца ў свядомасці двух персанажаў твора – наратара і кантралёра. Першаснае памылковае негатыўнае ўяўленне аб старой жанчыне раптоўна змяняецца на цалкам супрацьлеглыя пачуцці: здзіўленне ад нечаканага адкрыцця, сорам за хуткія непрадуманыя вывады, павагу да жанчынымаці.

Навела "Па дарозе ў прыгожы зялёны сад" Я. Сіпакова вылучаецца псіхалагізаванай формай уступнай часткі. Аўтар пачынае знаёмства з галоўнай гераіняй з характарыстыкі яе эмацыянальнага стану. Вызначальным момантам у дадзеным выпадку з'яўляецца тое, што паглыбленне ва ўнутраны стан персанажа не супярэчыць законам навелістычнага жанру, а, наадварот, садзейнічае іх раскрыццю дзякуючы адлюстраванню выразнай супярэчлівасці перажыванняў Купалкі: *вясёлая* і *радасная*, яна *спявае, жартуе і смяецца* ў час жалобы з прычыны заўчаснай смерці яе мужа.

Малая проза А. Брава вылучаецца адметным спалучэннем рэалістычнага кірунку з экзістэнцыйнымі матывамі. Знаходжанне гераіні навелістычнага апавядання "Змяя, пакрытая пёрамі птушкі сонца" ў пагранічнай сітуацыі абумоўлівае эвалюцыю яе свядомасці. Першы этап гэтага працэсу ўяўляе сабой спробу асобаснай самаідэнтыфікацыі, што скіроўвае пісьменніцу да пошуку вобразна-выяўленчых сродкаў, адпаведных надзвычай стракатай псіхалагічнай карціне. Мастацкі аналіз складанай самарэфлексіі абумоўлівае зварот А. Брава да камбінаванай формы псіхалагізму з павышанай увагай да знешніх дэталей, унутранага маналога, замоўчвання і г.д.

Адметны спосаб псіхалагізацыі прадстаўлены ў малой прозе У. Сцяпана (“Драпіны”, “Наперадзе цемра”, “Півоня”. “Букет. Медаль. Шапка”, “Адна капейка” і інш.), А. Федарэнкі (“Рэкляма”, “Рэдактар”, “Шчыліна”, “Сваяк” і інш.), Ю. Станкевіча (“Пакупнік сноў”, “Прытча пра жука-чарнацёлку”, “Стрыечніца” і інш.) і А. Глобуса (“Дамавікамерон” і “Дамавікамерон найноўшы”). З дадзенай мэтай аўтары прадуктыўна выкарыстоўваюць жэставамімікавую мову, што дазваляе раскрыць адметнасці мастацкай эмацыянальнай карціны ў лаканічным фармаце праз асобныя штрыхі, акцэнт на дэталях. Дадзены спосаб з’яўляецца найбольш прыдатным для навелы, бо дазваляе прытрымлівацца ўсталяваных жанравых канонаў, не выходзячы за межы лаканічнай структуры.

У большасці ж выпадкаў выкарыстанне магчымасцяў псіхалагічнага пісьма ў значнай ступені пашырае наратыўную прастору твораў, з аднаго боку, мадыфікуючы жанр навелы, з другога ж, істотна ўзбагачаючы яе магчымасці з пункту гледжання адлюстравання карціны свету ва ўсёй яе шматаспектнасці і поліфанічнасці.